литературное обозрение. — 2011. — № 109. — Режим доступу: http://magazines.russ.ru/nlo/2011/109/m32.html. — Дата доступа: 20.10.2013.
15. Лотман, Ю. Каноническое искусство как информационный парадокс / Ю. М. Лотман // Лотман Ю. Статьи по семиотике культуры и искусства. — Спб.: Академический проект, 2002. — С. 314–321.
16. Павличко, С. Теорія літератури / Соломія Павличко // передм. М. Зубрицької. — К.: Вид-во Соломії Павличко «Основи», 2002. — 680 с.
17. Перкінс, Д. Чи можлива історія літератури / Девід Перкінс; перекл. з англ. А. Іщенка. — К.: Вид. дім «Києво-Могилянська академія», 2005. — 152 с.
18. Тарнашинська, Л. Українське шістдесятництво: аберація явища у постмодерному прочитанні / Людмила Тарнашинська // Слово і час. — 2006. — № 3. — С. 59–71.
19. Шлегель, Ф. Мысли и мнения Лессинга / Ф. Шлегель // Шлегель Ф. Эстетика. Философия. Критика: в 2 т. — М.: Искусство.— 1983.— Т. 2. — С. 191–226.

*Анастасія Буйко (Мінск)*

## ГІСТОРЫЯ І ТЫПАЛОГІЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЧНЫХ ВЫДАННЯЎ

Тэрмін «энцыклапедыя» паходзіць ад старажытнагрэчаскага enkyklios paideia — «кола ведаў» і выкарыстоўваўся для азначэння комплексу навучання т. зв. «сямі вольных мастацтваў» — граматыкі, рыторыкі, геаметрыі, арыфметыкі, музыкі і астраноміі. Першыя энцыклапедыі былі створаны старажытнымі цывілізацыямі ў Егіпце, Кітаі, Грэцыі, Рыме. У Беларусі зараджэнне энцыклапедый узыходзіць да традыцыі Ф. Скарыны тлумачыць незразумелыя словы з дапамогай глос. Наступным крокам у гэтай справе можна лічыць выданне слоўніка Лаўрэнціем Зізаніем у Вільні ў 1596 г.: «Лексис, сиречь речения, в кратце собраны из славянскаго языка на простый руский диалект истолкованы». Развіццё ўласна энцыклапедый пачалося з рукапісных даведнікаў энцыклапедычнага характару — азбукоўнікаў, у якіх змяшчаліся артыкулы па прыродазнаўстве, філасофіі, тэалогіі, гісторыі. Трэба адзначыць, што сярод розных спосабаў тлумачэння слоў некаторыя нагадваюць энцыклапедычныя апісанні. У XIX — пач. XX ст. матэрыялы пра Беларусь змяшчаліся ў рускай і польскай энцыклапедыях. Першай спробай беларускага энцыклапедычнага даведніка быў аднатомнік «Беларуская Савецкая Сацыялістычная Рэспубліка» (1927), пабудаваны паводле тэматычнага прынцыпу. У 1932 г. пры АН БССР створана рэдакцыя «Беларускай Савецкай Энцыклапедыі», якая ў 1935 г. выдала 19 тэматычных слоўнікаў для будучай універсальнай энцыклапедыі, аднак сталінскія рэпрэсіі і Айчынная вайна перапынілі гэту работу. З 1967 г. выданне энцыклапедый ажыццяўляе спецыялізаванае выдавецтва «Беларуская энцыклапедыя імя Петруся Броўкі».

У сучасным разуменні энцыклапедыя — навуковыя або навукова-папулярныя даведачныя выданні, якія з’яўляюцца сістэматызаваным зводам ведаў. Па ступені ахопу матэрыялу энцыклапедыі падзяляюцца на ўніверсальныя, галіновыя, рэгіянальныя, персанальныя.

*Універсальныя* энцыклапедыі ўтрымліваюць звесткі па ўсіх галінах ведаў і практычнай дзейнасці чалавецтва. Для выкладу матэрыяла характэрны сінкрэтызм, шырокі ахоп фактаў і з’яў. Галоўная задача ўніверсальнай

энцыклапедыі — адлюстраванне свету з пункту гледжання пэўнага народа, асэнсаванне яго месца як нацыі ў кантэксце сусветнай культуры. Станаўленне еўрапейскіх нацый суправаджалася з'яўленнем менавіта такога тыпу энцыклапедый. Французская ўніверсальная энцыклапедыя ў 35 тамах «Энцыклапедыя, або Тлумачальны слоўнік навук, мастацтваў і рамесніцтваў» была створана ў 1751–1780 гг. пад кіраўніцтвам Дэні Дзідро і Жана Лерона Д'Аламбера. «Слоўнік мастацтваў і навук», створаны ў 1768–1771 гг. Эндрю Бэл, Колін Макфаркар і Уільям Смеллі паклалі пачатак стварэння англійскай універсальнай энцыклапедыі «Брытаніка» ў 24-х тт. У 1778–1804 гг. была выдадзена «Нямецкая энцыклапедыя, або Універсальны рэальны слоўнік усіх мастацтваў і навук» у 23 тамах. У XIX ст. універсальныя энцыклапедыі і энцыклапедычныя слоўнікі выйшлі ў Італіі, Аўстрыі, Чэхіі, Расіі, Аўстраліі, ЗША. У XX ст. такога тыпу выданні выйшлі ў Венгрыі, Румыніі, Югаславіі, Чэхаславакіі, Грэцыі, Нарвегіі, Бельгіі, Швейцарыі, Канадзе, Ізраіле, Іспаніі, Турцыі, Індыі, Японіі, Кітаі. Савецкае кіраўніцтва з першых часоў свайго існавання падтрымлівала развіццё энцыклапедыстыкі. У 1925 г. было створана выдавецтва «Савецкая энцыклапедыя», якое падрыхтавала больш за 700 найменняў энцыклапедый і слоўнікаў, у тым ліку тры выданні «Вялікай савецкай энцыклапедыі». У 1934 г. пры АН БССР была створана галоўная рэдакцыя «Беларускай савецкай энцыклапедыі», галоўнай мэтай якой была падрыхтоўка і выданне ўніверсальнай энцыклапедыі. Аднак па сацыяльна-палітычных прычынах распачатая праца была прыпынена з канца 1930-х гг. і адноўленая ў 1967 г. У 1969–1976 гг. падрыхтавана і апублікавана першая ў гісторыі беларускага народа ўніверсальная «Беларуская Савецкая Энцыклапедыя» ў 12 тамах, а ў 1996–2004 гг. — першая нацыянальная энцыклапедыя суверэннай Рэспублікі Беларусь «Беларуская энцыклапедыя» ў 18 тамах. Нацыянальная ўніверсальная энцыклапедыя каштоўная не толькі адпаведнасцю патрабаванням навуковасці, дакладнасці, аб'ектыўнасці і актуальнасці прыведзеных звестак, але і тым, наколькі поўна яна адлюстроўвае карціну свету нацыі, якая яе стварыла. Кожная нацыянальная энцыклапедыя адлюстроўвае пэўныя ракурсы гледжання на карціну свету, розныя спосабы яго асэнсавання, розныя мадэлі ўпарадкавання ведаў пра свет [1, с. 219–220].

*Галіновыя* энцыклапедыі ўтрымліваюць інфармацыю, якая ахоплівае якую-небудзь асобную галіну навукі ці практыкі. Па шырыні ахопу інфармацыі яна можа быць уласна галіновай, адлюстроўваючы галіну ў цэлым (напрыклад, «Педагагічная энцыклапедыя»), падгаліновай, прысвечанай адной з буйных частак галіны (напрыклад, «Ветэрынарная энцыклапедыя»), і міжгаліновай, утрымліваючай у сабе веды, неабходныя спецыялістам некалькіх галін (напрыклад, «Палітэхнічны слоўнік»). Сярод айчынных энцыклапедый: «Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі» (1984–1987), «Энцыклапедыя прыроды Беларусі» (1983–1986) абодва ў 5 тамах, «Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі» ў 7 тамах (1984–1988), «Беларускія пісьменнікі» ў 6 тамах (1992–1995), «Энцыклапедыя гісторыі Беларусі» ў 6 тамах (Мінск, 1993–2003),

«Тэатральная Беларусь» ў 2 тамах (2002–2003), «Беларускі фальклор» у 2 тамах (2005–2006), «Вялікае княства Літоўскае» ў 3 тамах (2007) і інш.

*Персанальныя* энцыклапедыі з'яўляюцца разнавіднасцю літаратурнай энцыклапедыі і прысвечаны пэўнаму пісьменніку. Яны ўключаюць усебаковыя звесткі пра пісьменніка і яго творчую працу, адлюстроўваюць шматграннасць і своеасаблівасць яго творчасці, а таксама ўзаемасувязь з нацыянальнай і сусветнай культурай; прызначаны для кумуляцыі вычарпальнай інфармацыі пра персону. Сярод літаратурных персанальных энцыклапедый можна назваць такія выданні як «Энцыклапедыя Бальзака» (Парыж, 1968), «Энцыклапедыя Дыкенса» (Лондан, 1971), «Шэкспіраўская энцыклапедыя» (Лондан, 1794), «Лермантаўская энцыклапедыя» (1981), «Шаўчэнкаўская энцыклапедыя» (у 6 т., выданне працягваецца). Сярод айчынных выданняў можна назваць выданні «Янка Купала» (Мінск, 1986), «Францыск Скарына і яго час» (Мінск, 1988, 1990), «Асветнікі зямлі беларускай. X — пачатак XX ст.» (Мінск, 2001), «Максім Багдановіч» (Мінск, 2011). Вызначальнымі рысамі вышэйпералічаных выданняў з'яўляюцца глабальны ахоп інфармацыі, імкненне найбольш поўна асвятліць усе пытанні , звязаныя з жыццём і творчасцю выбранага пісьменніка. Энцыклапедыі ствараліся на аснове спецыяльна распрацаванага спецыялістамі плана, пасля выдання шэрагу артыкулаў у перыядычных навуковых выданнях, абагульнення матэрыялу ў манаграфіях.

*Рэгіянальная* энцыклапедыя ўтрымлівае звесткі пра якую-небудзь частку света, краіну, яе адміністрацыйным ці геаграфічным раёне. Энцыклапедыі ўсіх відаў у залежнасці ад складу выдання могуць выходзіць у выглядзе поўных (вялікіх) энцыклапедый, якія ахопліваюць максімальную колькасць звестак, што адносяцца да кола пастаўленых праблем і кароткіх (малых) энцыклапедый, аб'ём якіх абмежаваны пэўнымі задачамі.

Па характары размеркавання матэрыялу энцыклапедыі падзяляюцца на *алфавітныя* (матэрыял размешчаны ў алфавітным парадку), *сістэматызаваныя* (матэрыял размешчаны суадносна пэўнай сістэме), *сістэмна-алфавітныя* (матэрыялы размешчаныя ў сістэматычным парадку і дапоўненыя кароткімі артыкуламі-даведкамі ў алфавітным парадку).

Па мастацка-тэхнічнаму і паліграфічнаму выкананню энцыклапедыі могуць быць *настольнымі* (вялікага фармату, разлічанымі на стацыянарнае выкарыстанне), *партатыўнымі* (сярэдняга фармату), *кішэннымі* (паменшанага фармату), *электроннымі* . Электроннае выданне — выданне, якое ўяўляе сабой электронны запіс інфармацыі (твора) на дыск і інш., разлічаны на выкарыстанне з дапамогай электронных тэхнічных сродкаў. Па характары носьбіта інфармацыі можна вылучыць два тыпы электронных выданняў: *мабільныя электронныя выданні* (для чытання з дыскаў для індывідуальнага карыстання з дапамогай любога персанальнага камп'ютэра; маюць меншую інфармацыйную зместавасць і статычныя, як і кнігі, маюць завершаную структуру) і *вэб-рэсурсы* (для неабмежаванага карыстання ўсіх чытачоў, што маюць доступ у Інтэрнет; не маюць фізічных характарыстык, завершанай структуры, характэрная асаблівасць — інтэрактыўнасць папаўнення). Яскравым прыкладам першага

тыпу энцыклапедый з’яўляецца «Энцыклапедыя Кірыла і Мяфодзія» (у 2 CD-дысках), другога — Вікіпедыя.

Літаратура

1. Суша, К. В. Универсальная энциклопедия как особый вид издания: культурологический аспект // Здабыткі: дакументальныя помнікі на Беларусі / Нацыянальная бібліятэка Беларусі; склад.: Л. Г. Кірухіна, К. В. Суша. — Мінск , 2009. — Вып. 11. — 319 с.
2. Развитие энциклопедической науки в России: метод. пособие по составлению и выпуску энциклопедических изданий / Академия российских энциклопедий; сост.: Г. Н. Малышев, Ю. Г. Маковецкая, Ю. А. Федорчук. — Челябинск, 2004. — 316 с.
3. Беларуская Энцыклапедыя імя Петруся Броўкі / укладальнік Л. В. Календа. — Мінск: БелЭн, 2005. — 264 с.

*Екатерина Наместникова (Минск)*

## ТРАНСФОРМАЦИЯ ДЕТЕКТИВНОГО ЖАНРА В РАССКАЗАХ КАРЕЛА ЧАПЕКА

Проблема места детектива в литературной системе разрабатывалась едва ли не с момента его оформления. Большинство литературоведов относят его к массовой литературе, однако многочисленные ученые, критики и писатели в своих трудах пытаются опровергнуть это мнение. Среди них находится и чешский прозаик и драматург Карел Чапек. В эссе «Холмсиана, или О детективных романах» писатель делает попытку раскрыть секрет популярности этого жанра, а также выделяет несколько ключевых мотивов, присутствующих в детективах.

Интерес К. Чапека к данному жанру не был явлением единичным. В первой половине XX в. в Европе вышли несколько работ, посвященных детективам. В Великобритании было издано «Искусство детективного рассказа» Остина Фримана, во Франции уже в 1920-е гг. предпринимались попытки описать историю данного жанра, в Германии Б. Брехт собирал материалы для исследования криминальной литературы, в Польше появились работы З. Василевского и К. Ижиковского. В СССР одним из первых жанр детектива описал В. Шкловский в своей «Теории прозы» (1933). Многообразие подходов к вопросу привело к появлению различных классификаций, однако мы остановимся на самой распространенной.

«Детективная литература традиционно определяется как ответвление от приключенческой литературы, посвященное раскрытию загадочных преступлений» [2, с. 90] — таково наиболее общее определение жанра, представленное в Литературном энциклопедическом словаре. Однако, говоря о книгах, посвященных преступлению, нужно разделять «криминальный» роман (рассказ), «триллер» и собственно детектив. Криминальная проза в своем наиболее литературном варианте может быть представлена Ф. М. Достоевским и его романом «Преступление и наказание». В книгах подобного жанра внимание сосредоточено непосредственно на преступлении, автора более занимают вопросы морали, нежели юридические аспекты. Часто в прозе такого рода